Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар
_____ А.І.Жук
“17” _____04_____ 2024 г.
Рэгістрацыйны № УД-27-3-№3-2024/вуч.

БЕЛАРУСКАЯ МОВА

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
7-07-0114-01 Спецыяльная і інклюзіўная адукацыя

2024 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта (249 ад 10.08.2023) і вучэбных планаў спецыяльнасці 7-07-0114-01 Спецыяльная і інклюзіўная адукацыя (23.02.2023, № 022-2023/у, № 030-2023/у, № 031-2023/у, № 034-2023/у, № 033-2023/у, № 035-2023/у)

СКЛАДАЛЬНІКІ:
А.С.Васілеўская, дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
А.Г.Міхалевіч, дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
Т.С.Бабровіч, старшы выкладчык кафедры беларускага і рускага мовазнаўства ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

РЭЦЭНЗЕНТЫ:
С.К.Берднік, дацэнт кафедры медыялінгвістыкі і рэдагавання факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт
Д.І.Дзятко, загадчык кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", доктар філалагічных навук, прафесар.

УЗГОДНЕНА
Дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Пачатковая школа № 103 г. Мінска»
_____ М.А.Макарэвіч
«19» 03 2024 г.

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:
Кафедрай беларускага і рускага мовазнаўства ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
пратакол № 10 ад 20.03.2024

Загадчык кафедры
_____ Н.М.Антановіч

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 6 ад 16.04.2024);

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных матэрыялаў дзейным патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.
Метадыст вучэбна-метадычнага
аддзела _____ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі _____ Н.П.Сяткоўская

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Прыкладная вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская мова” распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта агульнай вышэйшай адукацыі па “Спецыяльнай і інклюзіўнай адукацыі”.

Вучэбная дысцыпліна “Беларуская мова” скіравана на ўдасканаленне моўнай і маўленчай кампетэнцый, на далучэнне студэнтаў да багацця нацыянальнай культуры, на фарміраванне камунікатыўна развітай асобы, здольнай наладжваць зносіны на беларускай мове ва ўсіх сферах, у тым ліку і ў прафесійнай дзейнасці, перакладаць і рэферыраваць прафесійна арыентаваныя і навуковыя тэксты, весці дзелавую дакументацыю, выступаць з навуковымі паведамленнямі і публічнымі прамовамі і інш.

Мэта дысцыпліны – выпрацаваць і замацаваць практычныя ўменні і навыкі карыстання вусным і пісьмовым маўленнем для граматнага праектавання адукацыйнага працэсу з навучэнцамі з асаблівымі адукацыйнымі патрэбамі.

Задачы вучэбнай дысцыпліны:

- спрыяць практычнаму авалоданню нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы;
- актыўна ўдасканальваць маўленчую практыку студэнтаў, садзейнічаць узбагачэнню іх прафесійнага тэзаўруса
- сфарміраваць у студэнтаў разуменне неабходнасці ведаць і карыстацца беларускай мовай у прафесійнай дзейнасці;
- садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных, творчых і крытычна думаючых спецыялістаў, здольных вырашаць складаныя моўна-сацыяльныя праблемы бытавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму.

Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста адпаведнага профілю, сувязі з іншымі вычэбнымі дысцыплінамі

Вучэбная дысцыпліна “Беларуская мова»з’яўляецца дысцыплінай дзяржаўнага кампанента, уваходзіць у “Лінгвістычны модуль” і звязана з вучэбнай дысцыплінай “Руская мова”, вывучэнне якой дазваляе пазбегнуць інтэрферэнцыйных памылак як у рускай, так і ў беларускай мове.

Патрабаванні да асваення вучэбнай дысцыпліны

Вучэбная дысцыпліна «Беларуская мова» накіравана на фарміраванне ў студэнтаў **базавай універсальнай кампетэнцыі БПК-7:** Праектаваць і рэалізоўваць адукацыйны працэс з улікам медыка-біялагічных, псіхалагічных і лінгвістычных асноў педагагічнай дзейнасці; **спецыялізаванай кампетэнцыі СК-1**: Праектаваць адукацыйны працэс з навучэнцамі з асаблівымі адукацыйнымі патрэбамі на аснове сістэмы медыка-біялагічных, псіхалагічных, лінгвістычных ведаў і ўменняў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Беларуская мова” студэнт павінен

ведаць:

- сістэмную арганізацыю беларускай мовы, яе ўзроўні (фанетычнага, лексічнага, граматычнага і інш.) і іх узаемасувязі;
- нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы;
- асноўныя лексікаграфічныя даведнікі;

умець:

- выкарыстоўваць у прафесійнай дзейнасці тэарэтычныя веды і рэсурсы беларускай мовы з улікам іх стылістычнай дыферэнцыяцыі;
- рэалізоўваць нарматыўную базу беларускай мовы ў маўленчай дзейнасці;

валодаць:

- ведамі аб мове як шматфункцыянальнай сістэме, якая пастаянна развіваецца;
- ведамі аб моўнай норме і нормах маўленчых паводзін у розных сферах і сітуацыях зносін;
- навыкамі фанетычнага, марфемнага, словаўтваральнага, марфалагічнага і сінтаксічнага аналізу моўных адзінак;
- арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасцю;
- уменнем будаваць звязнае выказванне;
- уменнем карыстацца лінгвістычнымі слоўнікамі і даведнікамі;
- уменнем працаваць над выпраўленнем арфаграфічных, пунктуацыйных, граматычных, лексічных і маўленчых памылак.

Агульная колькасць гадзін і колькасць аўдыторных гадзін, што адводзяцца на вывучэнне дысцыпліны

Дысцыпліна вывучаецца на 2 курсе ў 3 семестры. На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Беларуская мова» адведзена 108 гадзін.

Для дзённай формы атрымання адукацыі 48 аўдыторных, з іх лекцыі – 18 гадзін (з іх 2 гадзін на КСР), практычныя – 30 гадзін (з іх 4 на КСР). На самастойную працу адведзена 60 гадзін.

Рэкамендаваная форма прамежкавай атэстацыі – залік.

На завочнай форме атрымання адукацыі дысцыпліна вывучаецца на 2 курсе ў 3 семестры. Вывучэнне дысцыпліны разлічана на 12 аўдыторных гадзін, у тым ліку 4 – лекцыйныя, 8 – практычных.

У 4 семестры форма кантролю – залік.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

1. Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей

Беларуская мова сярод іншых моў свету. Беларуская мова – форма нацыянальнай культуры беларусаў. Нацыянальная мова. Дзяржаўная мова. Нормы літаратурнай мовы.

Паходжанне беларускай мовы і асноўныя этапы яе развіцця. Старабеларуская літаратурная мова XIV – XVI стст. Дзяржаўны статус беларускай мовы ў Вялікім Княстве Літоўскім. Нацыянальна-моўная палітыка Рэчы Паспалітай і яе вынікі. Новая (сучасная) беларуская мова XIX – пачатку XX стст. Развіццё і функцыянаванне беларускай літаратурнай мовы ў XX – пачатку XXI ст.

Фунцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму. Інтэрферэнцыя, яе віды.

2. Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія

Фанетыка як раздзел мовазнаўства. Асноўныя фанетычныя адзінкі: гук, склад, фанетычнае слова, маўленчы такт, фраза, тэкст; націск, інтанацыя. Фанетычная транскрыпцыя.

Гукі беларускай мовы. Акустычны, артыкуляцыйны і функцыянальны аспекты вывучэння гукаў мовы. Паняцце пра фаналогію.

Галосныя гукі. Класіфікацыя галосных гукаў.

Зычныя гукі. Класіфікацыя зычных гукаў.

Моцная і слабая пазіцыі гукаў. Узаемадзеянне гукаў у маўленчай плыні. Пазіцыйныя і камбінаторныя змены галосных і зычных гукаў. Рэдукцыя галосных. Асіміляцыя і дысіміляцыя. Фанетычнае падаўжэнне і марфалагічнае падваенне зычных. Пераход [*у*], [*в*], [*л*] у [*ў*]. Дзеканне і цеканне. Іншыя змены зычных гукаў. Прыстаўныя галосныя і зычныя гукі. Фанетычныя і гістарычныя чаргаванні гукаў.

Фанетычныя асаблівасці беларускай мовы ў сістэме галосных і зычных гукаў (у параўнанні з рускай мовай).

Фанетычны разбор слова.

Арфаэпія, яе прадмет і задачы. Арфаэпічная норма і культура маўлення. Прычыны адхіленняў ад нормаў літаратурнага вымаўлення.

Асноўныя нормы літаратурнага вымаўлення націскных і ненаціскных галосных, зычных і спалучэнняў зычных гукаў. Вымаўленне некаторых граматычных форм.

Графіка, яе прадмет і задачы. Пісьмо і яго віды. Беларускі алфавіт. Літары, іх гукавое значэнне. Нялітарныя графічныя сродкі: апостраф, злучок (дэфіс), пунктуацыйныя знакі, знак націску, знак параграфа. Функцыі літар *е, ё, ю, я, і*. Абазначэнне мяккасці зычных на пісьме. Гукавы і складовы прынцыпы беларускай графікі.

Графічны разбор слова.

Арфаграфія, яе прадмет і задачы. Апорнае напісанне і арфаграма. Раздзелы арфаграфіі. Прынцыпы беларускай арфаграфіі. Правілы, заснаваныя на фанетычным і марфалагічным прынцыпах напісання. Дыферэнцыйныя і традыцыйныя напісанні ў сучаснай беларускай мове.

Арфаграфічны разбор слова.

3. Лексікалогія. Фразеалогія

Лексікалогія як раздзел мовазнаўства. Лексічны склад мовы. Слова як асноўная цэласная адзінка мовы. Лексічнае і граматычнае значэнні слова. Слова і паняцце. Слова і словаформа.

Лексічнае значэнне слова. Тыпы лексічных значэнняў слова. Мнагазначнасць слова. Прамое (асноўнае) і пераносная (вытворнае) значэнні слова. Тыпы пераносу значэнняў слова: метафара, метанімія, сінекдаха. Тлумачальныя слоўнікі.

Амонімы. Лексічныя амонімы. Амаформы, амафоны, амографы. Шляхі ўзнікнення амонімаў. Выкарыстанне амонімаў у мове. Слоўнік амонімаў.

Сінонімы. Сінанімічны рад, дамінанта. Разрады сінонімаў: семантычныя (ідэаграфічныя), стылістычныя, семантыка-стылістычныя. Кантэкстуальныя сінонімы. Шляхі ўзнікнення сінонімаў. Слоўнік сінонімаў.

Антонімы, іх тыпы. Стылістычнае выкарыстанне антонімаў. Антытэза. Аксюмаран. Слоўнік антонімаў.

Паронімы. Слоўнік паронімаў.

Фразеалогія як раздзел мовазнаўства. Разуменне фразеалогіі ў вузкім і шырокім сэнсе.

Класіфікацыя фразеалагізмаў. Суадноснасць фразеалагізма з іншымі адзінкамі мовы (словам, свабодным словазлучэннем, сказам). Асноўныя асаблівасці фразеалагічных адзінак. Крыніцы ўзнікнення беларускай фразеалогіі. Асаблівасці перакладу фразеалагізмаў з рускай мовы на беларускую.

Прыказкі, устойлівыя параўнанні, афарызмы. Перыфразы.

4. Марфемная будова слова. Словаўтварэнне

Марфема, яе адметныя рысы. Тыпы марфем. Свабодныя і звязаныя карані. Словаўтваральныя і формаўтваральныя марфемы. Аснова слова і канчатак. Невытворныя, вытворныя і суплетыўныя асновы. Афіксы.

Словаўтваральны тып і словаўтваральны спосаб. Асноўныя спосабы ўтварэння слоў у беларускай мове. Марфалагічнае словаўтварэнне і яго віды (афіксацыя, бязафікснае ўтварэнне). Складанне, абрэвіяцыя. Лексіка-семантычны, лексіка-сінтаксічны і марфолага-сінтаксічны спосабы.

5. Марфалогія

Марфалогія як частка граматыкі. Асноўныя паняцці марфалогіі. Граматычныя значэнні і граматычныя катэгорыі. Часціны мовы як лексіка-граматычныя класы слоў. Прынцыпы размежавання часцін мовы. Сістэма часцін мовы ў беларускай мове. Пераходныя з’явы ў сістэме часцін мовы.

Назоўнік як часціна мовы: лексічнае значэнне, граматычныя катэгорыі і сінтаксічныя функцыі. Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў.

Граматычныя катэгорыі назоўнікаў: род, лік, склон.

Скланенне назоўнікаў у сучаснай беларускай мове. Тры тыпы скланення назоўнікаў. Варыянты склонавых канчаткаў назоўнікаў. Рознаскланяльныя і нескланяльныя назоўнікі. Скланенне назоўнікаў у множным ліку. Скланенне ўласных імён, прозвішчаў, геаграфічных назваў.

Правапіс суфіксаў назоўнікаў. Правапіс складаных назоўнікаў.

Марфалагічны разбор назоўнікаў.

Прыметнік як часціна мовы: лексічнае значэнне, граматычныя катэгорыі і сінтаксічныя функцыі. Разрады прыметнікаў. Пераход прыметнікаў з аднаго разраду ў другі.

Поўныя і кароткія формы прыметнікаў. Ужыванне кароткай формы якасных прыметнікаў у беларускай мове.

Ступені параўнання якасных прыметнікаў, іх значэнне і ўтварэнне. Асаблівасці ўтварэння формаў ступеняў параўнання ў беларускай і рускай мовах. Формы суб'ектыўнай ацэнкі прыметнікаў.

Скланенне якасных, адносных і прыналежных прыметнікаў. Варыянты склонавых канчаткаў прыметнікаў. Правапіс суфіксаў прыметнікаў.

Правапіс складаных прыметнікаў.

Марфалагічны разбор прыметнікаў.

Лічэбнік як часціна мовы: лексічнае значэнне, граматычныя катэгорыі і сінтаксічныя функцыі. Разрады лічэбнікаў. Скланенне лічэбнікаў розных разрадаў. Правапіс лічэбнікаў.

Марфалагічны разбор лічэбнікаў.

Займеннік як часціна мовы: лексічнае значэнне, граматычныя катэгорыі і сінтаксічныя функцыі. Разрады займеннікаў па суадноснасці з іншымі часцінамі мовы. Разрады займеннікаў паводле іх значэння. Скланенне займеннікаў, іх правапіс. Ужыванне і правапіс займеннікаў у беларускай мове.

Марфалагічны разбор займеннікаў.

Дзеяслоў як часціна мовы: лексічнае значэнне, граматычныя катэгорыі і сінтаксічныя функцыі. Спрагальныя і неспрагальныя, зменныя і нязменныя формы дзеяслова.

Неазначальная форма дзеяслова (інфінітыў), яе граматычныя катэгорыі і сінтаксічныя функцыі. Прэдыкатыўныя і непрэдыкатыўны катэгорыі дзеяслова. Спражэнне дзеясловаў.

Правапіс суфіксаў дзеясловаў.

Марфалагічны разбор дзеясловаў.

Дзеепрыметнік як зменная форма дзеяслова. Утварэнне дзеепрыметнікаў незалежнага і залежнага стану. Асаблівасці ўжывання дзеепрыметнікаў у беларускай мове (у параўнанні з рускай). Пераклад дзеепрыметнікаў з рускай мовы на беларускую.

Марфалагічны разбор дзеепрыметнікаў.

Дзеепрыслоўе як нязменная форма дзеяслова. Дзеепрыслоўі закончанага і незакончанага трывання, іх утварэнне. Асаблівасці ўжывання дзеепрыслоўяў у

беларускай мове. Сродкі замены дзеепрыметнікаў пры перакладзе з рускай мовы на беларускую.

Марфалагічны разбор дзеепрыслоўяў.

Прыслоўе як часціна мовы. Безасабова-прэдыкатыўныя словы. Лексічнае значэнне, граматычныя катэгорыі і сінтаксічныя функцыі прыслоўяў. Разрады прыслоўяў паводле значэння. Ступені параўнання, формы суб'ектыўнай ацэнкі якасных прыслоўяў. Правапіс прыслоўяў.

Марфалагічны разбор прыслоўяў.

Лексічнае значэнне, граматычныя катэгорыі і сінтаксічная функцыя безасабова-прэдыкатыўных слоў (катэгорыі стану).

Службовыя часціны мовы. Прыназоўнік як службовая часціна мовы. Разрады прыназоўнікаў. Ужыванне прыназоўнікаў з рознымі склонамі. Правапіс прыназоўнікаў.

Марфалагічны разбор прыназоўнікаў.

Злучнік як службовая часціна мовы. Разрады злучнікаў. Злучнікі і злучальныя словы. Правапіс злучнікаў.

Марфалагічны разбор злучнікаў.

Часціцы як службовая часціна мовы. Разрады часціц. Правапіс часціц. Ужыванне часціц не і ні з рознымі часцінамі мовы.

Марфалагічны разбор часціц.

Выклічнік як часціна мовы. Разрады выклічнікаў. Функцыі выклічнікаў у мове. Гукапераймальныя словы.

6. Сінтаксіс і пунктуацыя

Сінтаксіс, яго прадмет і задачы. Асноўныя сінтаксічныя адзінкі: словазлучэнне, сказ, тэкст. Сінтаксічная сувязь (злучэнне, падпарадкаванне).

Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Асноўныя прыметы словазлучэння.

Свабодныя і несвабодныя, простыя і складаныя словазлучэнні. Тыпы словазлучэнняў паводле лексіка-марфалагічнага выражэння галоўнага слова. Сэнсавыя адносіны паміж кампанентамі словазлучэння. Віды падпарадкавальнай сінтаксічнай сувязі слоў у словазлучэнні. Асаблівасці будовы словазлучэнняў у беларускай мове (у параўнанні з рускай).

Сінтаксічны разбор словазлучэнняў.

Просты сказ як сінтаксічная адзінка. Асноўныя прыметы сказа. Тыпы сказаў.

Двухсастаўныя сказы. Галоўныя і даданыя члены сказа.

Аднасастаўныя сказы. Тыпы аднасастаўных сказаў.

Сінтаксічна непадзельныя сказы.

Няпоўныя сказы. Разнавіднасці няпоўных сказаў. Адрозненне няпоўных сказаў ад аднасастаўных.

Агульная характарыстыка простага ўскладненага сказа. Віды ўскладненых сказаў.

Сказы з аднароднымі членамі. Абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа. Аднародныя і неаднародныя азначэнні. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа.

Сказы з адасобленымі членамі. Паняцце пра адасабленне. Умовы адасаблення даданых членаў сказа. Знакі прыпынку пры адасобленых членах сказа.

Сказы з параўнальнымі зваротамі. Структура і функцыі параўнальных зваротаў. Знакі прыпынку пры параўнальных зваротах.

Сказы з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі. Адрозненне пабочных і ўстаўных канструкцый. Знакі прыпынку пры пабочных і ўстаўных словах, словазлучэннях і сказах.

Сказы са звароткам. Значэнне, спосабы выражэння і ўжыванне звароткa. Знакі прыпынку пры зваротку.

Сінтаксічны разбор простых сказаў.

Складаны сказ як сінтаксічная адзінка. Сэнсавае і інтанацыйнае адзінства частак складанага сказа. Тыпы адносін паміж часткамі складаных сказаў, сродкі іх выражэння. Злучэнне і падпарадкаванне ў складаным сказе. Прынцыпы класіфікацыі складаных сказаў. Тыпы складаных сказаў: складаназлучаныя, складаназалежныя, бяззлучнікавыя, скаладныя сказы з рознымі відамі сувязі. Знакі прыпынку ў складаных сказах.

Сінтаксічны разбор складаных сказаў.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА

(дзённая форма атрымання адукацыі)

Нумар раздзела, тэмы,	Назва раздзела, тэмы	Колькасць аўдыторных гадзін				Самастойная работа	Літаратура	Формы кантролю знанняткаў
		лекцыі	практычныя заняткі	КСР				
				лекцыі	практычныя			
1	2	3	4	5	6	7	8	9
II курс, 3 семестр								
1	**Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей**	**2**				**4**	[1, 4]	стварэнне ментальных карт
2	**Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія**	**4**	**6**		**2**	**14**		
2.1	Фанетыка як раздзел мовазнаўства	2					[1, 4]	распрацоўка схем
2.2	Гукі беларускай мовы		2			4	[1, 3, 4]	практычныя заданні
2.3	Моцная і слабая пазіцыі гукаў. Фанетычны разбор слова		2			4	[1, 2, 3, 4]	фанетычны разбор
2.4	Арфаэпія, яе прадмет і задачы	2					[1, 4]	вуснае выказванне
2.5	Асноўныя нормы літаратурнага вымаўлення націскных і ненаціскных галосных, зычных і спалучэнняў зычных гукаў				2	2	[1, 3, 4]	практычныя заданні

2.6	Графіка, яе прадмет і задачы.		1			2	[1, 2, 3, 4]	графічны разбор
2.7	Арфаграфія, яе прадмет і задачы		1			2	[1, 2, 3, 4, 7]	арфаграфічны разбор
3.	**Лексікалогія. Фразеалогія**	**2**	**4**			**8**		
3.1	Лексікалогія як раздзел мовазнаўства. Лексічны склад мовы	1					[1, 4]	стварэнне ментальных карт
3.2	Лексічнае значэнне слова		2			4	[1, 3, 4, 10, 11]	практычныя заданні
3.3	Фразеалогія як раздзел мовазнаўства	1					[1, 4]	стварэнне ментальных карт
3.4	Класіфікацыя фразеалагізмаў		2			4	[1, 3, 4, 12]	практычныя заданні
4.	**Марфемная будова слова. Словаўтварэнне**	**2**				**2**	[1, 4, 5, 6]	марфемны, словаўтваральны разбор
5	**Марфалогія**	**4**	**12**		**2**	**18**		
5.1	Марфалогія як частка граматыкі. Назоўнік як часціна мовы	2					[1, 4]	франтальнае апытванне
5.2	Скланенне назоўнікаў у сучаснай беларускай мове		2			4	[1, 3, 4]	практычныя заданні
5.3	Марфалагічны разбор назоўнікаў		2				[1, 2, 3, 4]	практычныя заданні
5.4	Прыметнік як часціна мовы		2				[1, 2, 3, 4]	марфалагічны разбор
5.5	Лічэбнік як часціна мовы. Займеннік як часціна мовы		2			4	[1, 2, 3, 4]	марфалагічны разбор
5.6	Дзеяслоў як часціна мовы	2				2	[1, 4]	марфалагічны разбор

5.7	Марфалагічны разбор дзеясловаў		2				[1, 2, 3, 4]	практычныя заданні
5.8	Дзеепрыметнік як зменная форма дзеяслова. Дзеепрыслоўе як нязменная форма дзеяслова		2			4	[1, 2, 3, 4]	марфалагічны разбор
5.9	Прыслоўе як часціна мовы. Безасабова-прэдыкатыўныя словы				1	2	[1, 2, 3, 4]	марфалагічны разбор
5.10	Службовыя часціны мовы. Выклічнік				1	2	[1, 2, 3, 4]	марфалагічны разбор
6	**Сінтаксіс і пунктуацыя**	**2**	**4**	**2**		**14**		
6.1	Сінтаксіс, яго прадмет і задачы. Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка	2				2	[1, 4]	стварэнне ментальных карт
6.2	Просты сказ як сінтаксічная адзінка			2		4	[1, 2, 3, 4]	сінтаксічны разбор
6.3	Агульная характарыстыка простага ўскладненага сказа		2			4	[1, 2, 3, 4]	практычныя заданні
6.4	Складаны сказ як сінтаксічная адзінка		2			4	[1, 2, 3, 4]	сінтаксічны разбор
	Усяго	***16***	***26***	***2***	***4***	***60***		***залік***

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
(для студэнтаў завочнай формы атрымання адукацыі)

Нумар раздзела, тэмы,	Назва раздзела, тэмы	Колькасць аўдыторных гадзін		Літаратура	Формы кантролю знаняткаў
		лекцыі	практычныя заняткі		
1	2	3	4	5	6
III курс, 3 семестр					
2	**Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія**	**2**	**2**		
2.1	Фанетыка як раздзел мовазнаўства. Асноўныя фанетычныя адзінкі: гук, склад, фанетычнае слова, маўленчы такт, фраза, тэкст; націск, інтанацыя	2		[1, 4]	фанетычны разбор
2.2	Гукі беларускай мовы		2	[1, 2, 3, 4]	практычныя заданні
3	**Лексікалогія**		**2**		
3.1	Лексічнае значэнне слова		2	[1, 2, 3, 4]	практычныя заданні
5	**Марфалогія**	**2**	**4**		
5.1	Марфалогія як частка граматыкі	2		[1, 4]	
5.2	Назоўнік як часціна мовы		2	[1, 2, 3, 4]	марфалагічны

					разбор
5.3	Дзеяслоў як часціна мовы		2	[1, 2, 3, 4]	марфалагічны разбор
	Усяго за семестр:	***4***	***8***		
	III курс, 4 семестр				***залік***

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

АСНОЎНАЯ ЛІТАРАТУРА

1. Сучасная беларуская літаратурная мова : вучэб. дапам. / Д. В. Дзятко [і інш.] ; пад рэд. Д. В. Дзятко. – Мінск : Выш. шк., 2017. – 588 с.

ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА

2. Азарка, В.У. Беларуская мова: аналіз моўных адзінак : дапам. / В. У. Азарка, А. С. Васілеўская.– Мінск: БДПУ, 2011. – 116 с.

3. Грыгор’ева, Л. М. Сучасная беларуская мова. Зборнік практыкаванняў : вучэб. дапам. / Л.М.Грыгор’ева, Г.Ф.Андарала. – Мінск : Выш. шк., 2010. – 368 с.

4. Сучасная беларуская мова : вучэб. дапам./ Л.М.Грыгор’ева [і інш.] ; пад агульн.рэд. Л. М. Грыгор’евай. – Мінск : Выш. шк., 2010. –559 с.

СЛОЎНІКІ І ДАВЕДНІКІ

5. Бардовіч, А. М. Марфемны слоўнік беларускай мовы / А. М. Бардовіч, Л. М. Шакун. – 2-е выд. – Мінск : Выш. шк., 1989. – 718 с.

6. Бардовіч, А. М. Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы / А. М. Бардовіч, М. М. Круталевіч, А. А. Лукашанец. – Мінск : Беларус. навука, 2000.– 413 с.

7. Беларускі арфаграфічны слоўнік / пад рэд. А.А.Лукашанца. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 695 с.

8. Беларуская мова: энцыклапедыя /пад. рэд. А.Я.Міхневіча; рэдкал. Б. І. Сачанка (гал.рэд.) і інш.– Мінск: БелЭн, 1994.– 655 с.

9. Булыка, А. М. Слоўнік іншамоўных слоў : у 2 т./ А. М. Булыка. – Мінск : Беларус. энцыкл., 1999. – 2 т.

10. Грабчыкаў, С. М. Слоўнік паронімаў беларускай мовы / С. М. Грабчыкаў. – Мінск : Нар. асвета, 1994. – 478 с.

11. Клышка, М. К. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў / М. К. Клышка. – 2-е выд. – Мінск: Выш. шк., 1993. – 445 с.

12. Лепешаў, І. Я. Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы : у 2 т. / І. Я. Лепешаў. – Мінск : БелСЭ імя П.Броўкі, 1993.– 2 т.

13. Слоўнік беларускай мовы / нав. рэдактары: А. А. Лукашанец, В. П. Русак. – Мінск : Беларус.навука, 2012. – 916 с.

РЭКАМЕНДАВАНЫЯ ФОРМЫ І МЕТАДЫ НАВУЧАННЯ

Асноўнымі метадамі (формамі) навучання з’яўляюцца: метады праблемнага навучання, інтэрактыўныя метады, параўнальны метад, выкарыстанне тэхналогій вучэбна-даследчай дзейнасці, камунікатыўных сітуатыўных практыкаванняў.

ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для дыягностыкі кампетэнцый, выяўлення вучэбных дасягненняў студэнтаў у працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Беларуская мова” прадугледжваецца прамежкавая і выніковая ацэнка.

Для кантролю якасці засваення ведаў па вучэбнай дысцыпліне рэкамендуецца наступны дыягнастычны інструментарый:

тэст вучэбных дасягненняў,
дыктант,
кантрольная работа,
вуснае і пісьмовае паведамленні,
залік.

МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Для самастойнай работы студэнтаў прапануюцца заданні па тэмах, асноўны матэрыял якіх разгледжаны на аўдыторных занятках, індывідуальныя заданні, закліканыя пашырыць кругагляд студэнтаў, паглыбіць іх веды, развіць уменні даследчай дзейнасці, праявіць элементы творчасці.

Пры вывучэнні дысцыпліны рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя формы самастойнай работы студэнтаў:

- падрыхтоўка і напісанне рэфератаў, анатацый, эсэ і іншых пісьмовых работ;
- падбор і аналіз літаратурных крыніц;
- распрацоўка і складанне схем, табліц;
- выкананне практыкаванняў.

Патрабаванні да выканання самастойнай работы студэтаў

№ п/п	Назва тэмы, раздзела	Колькасць гадзін на СРС	Заданне	Форма выканання
1	Беларуская нацыянальная мова, яе формы	4	аналіз артыкулаў энцыклапедыі “Беларуская мова”	стварэнне храналагічнай стужкі
2	Гукі беларускай	4	абагульненне	распрацоўка

	мовы		матэрыялу, выкананне тэставых заданняў,	схем, выкананне практыкаванняў
3	Моцная і слабая пазіцыі гукаў. Фанетычны разбор слова	4	фанетычная транскрыпцыя, выкананне фанетычнага разбору	выкананне практыкаванняў
4	Асноўныя нормы літаратурнага вымаўлення націскных і ненацiскных галосных, зычных і спалучэнняў зычных гукаў	2	падбор скорагаворак	вусныя паведамленні
5	Графіка. Пісьмо і яго віды	2	графічны аналіз слоў	стварэнне прэзентацый, на платформе MOODLE
6	Арфаграфія, яе прадмет і задачы	2	выкананне тэставых заданняў, арфаграфічны аналіз	на платформе MOODLE
7	Лексічнае значэнне слова	4	абагульненне матэрыялу, распрацоўка пашпарта слоў	выкананне практыкаванняў, запаўненне табліц
8	Класіфікацыя фразеалагізмаў	4	аналіз выкарыстання фразеалагічных адзінак у мастацкіх творах для дзяцей	вусныя паведамленні
9	Марфемная будова слова. Словаўтварэнне	2	выкананне тэставых заданняў	на платформе MOODLE
10	Скланенне назоўнікаў у сучаснай беларускай мове	4	абагульненне матэрыялу, падрыхтоўка да кантрольнай работы	распрацоўка табліц парадыгмы скланення, выкананне практыкаванняў
11	Лічэбнік як часціна мовы. Займеннік як часціна мовы	4	сістэматызацыя тэарэтычнага матэрыялу, выкананне тэставых заданняў	выкананне практыкаванняў, на платформе MOODLE

12	Дзеяслоў як часціна мовы	2	сістэматызацыя тэарэтычнага матэрыялу	выкананне практыкаванняў, на платформе MOODLE
13	Дзеепрыметнік як зменная форма дзеяслова. Дзеепрыслоўе як нязменная форма дзеяслова	4	абагульненне матэрыялу	распрацоўка табліц, выкананне практыкаванняў
14	Прыслоўе як часціна мовы. Безасабова-прэдыкатыўныя словы	2	параўнальны аналіз прыслоўяў і безасабова-прэдыкатыўных слоў	распрацоўка схем, выкананне практыкаванняў
15	Службовыя часціны мовы. Выклічнк	2	параўнальны аналіз службовых часцін мовы, выкананне тэставых заданняў	выкананне практыкаванняў, на платформе MOODLE
16	Сінтаксіс, яго прадмет і задачы. Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка	2	аналіз і сістэматызацыя тэарэтычнага матэрыялу	выкананне практыкаванняў, на платформе MOODLE
17	Просты сказ як сінтаксічная адзінка	4	аналіз і сістэматызацыя тэарэтычнага матэрыялу	выкананне практыкаванняў
18	Агульная характарыстыка простага ўскладненага сказа	4	аналіз тэарэтычнага матэрыялу, выкананне тэставых заданняў	выкананне практыкаванняў, на платформе MOODLE
18	Складаны сказ як сінтаксічная адзінка	4	аналіз і сістэматызацыя тэарэтычнага матэрыялу	распрацоўка схем
	Усяго	***60***		

Прыкладны пералік заданняў кіруемай самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне

Лекцыі

Тэма ***“Просты сказ як сінтаксічная адзінка” (2 гадзіны)***

Узровень 1 (азнаямленне, разуменне) – максімальная адзнака 6 балаў

На аснове вывучэння матэрыялаў дапаможнікаў “Беларуская мова” [1; 4] зрабіць канспект па тэме.

Узровень 2 (прымяненне, аналіз) – максімальная адзнака 8 балаў

На аснове вывучэння матэрыялаў дапаможнікаў “Беларуская мова” [1; 4] зрабіць табліцы па тэме.

Узровень 3 (сінтэз, ацэнка) – максімальная адзнака 10 балаў

На аснове вывучэння матэрыялаў дапаможнікаў “Беларуская мова” [1; 4] зрабіць схемы па тэме, выкарыстоўваючы платформу http://linoit.com.

Практычныя заняткі

Тэма ***“Асноўныя нормы літаратурнага вымаўлення націскных і ненаціскных галосных, зычных і спалучэнняў зычных гукаў” (2 гадзіны)***

Узровень 1 (азнаямленне, разуменне) – максімальная адзнака 6 балаў

1. Затранскрыбіруйце словы, назавіце фанетычныя працэсы, у выніку якіх яны набылі такое гучанне. Запішыце арфаэпічныя нормы, якім павінна падпарадкоўвацца вымаўленне гэтых слоў: бясшумна, вечны, дакладчык, злуешся, парыжскі, людскі, збіраешся, пры вадакачцы, магчымасць, у лодцы, просішся, у каробачцы, імкнешся, агледзьце, латышскі, мазгі, подзвіг, экзамен, возера.

Узровень 2 (прымяненне, аналіз) – максімальная адзнака 8 балаў

1. Выпішыце з тэксту словы, у якіх могуць быць дапушчаны арфаэпічныя памылкі. Запішыце арфаэпічныя нормы, якім павінна падпарадкоўвацца вымаўленне гэтых слоў.

Вось так во рынешся дзе-небудзь пасярод лугу ці на беразе рэчкі ў шчыкатлівую траву, зарыешся ў яе носам ці пакладзеш рукі пад галаву, будзеш ляжаць доўга, усведамляючы, што на гэты час усё — і машыны, і спрэчкі, і нарады, і штодзённая мітусня — засталося недзе далёка-далёка і ўжо вось тут, у траве, уяўляецца як нешта нерэальнае і неакрэсленае (Я. Сіпакоў).

Узровень 3 (сінтэз, ацэнка) – максімальная адзнака 10 балаў

1. Пры назіранні над маўленнем жанчыны былі занатаваны наступныя выразы. Выпішыце словы, якія не адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы. Запішыце да гэтых дыялектных слоў іх літаратурны адпаведнік у транскрыпцыі.

ўтр’а /□ўс’а быц’ за□Аб’ішча ўтр’іга□р’ішчуў … ныза□дз’іў, тува□ш сус’е□ц’/ пызав’о□ла кынча□да дз’е□на чыцца гос’ц’□йіцца, то зна□с’ц’і, раз кот мы□йа го□ дыраг’і□дуц’ і майе□пр’ійе н’н’а йа□в’іц’ ц’і што?/ с’а□да гато□б’інна на□ асо□у хату / дл’і ц’яб’е ў у□йц’я/ ну,

м’ідз’в’адз’о□ц’і аддыха□рм’і, а вы тут у ха□р’у на хв’е□дз’ажу йос’ц.□, а ваўк’і□шна н’іма□нас кан’е

Тэма ***“Прыслоўе як часціна мовы. Безасабова-прэдыкатыўныя словы. Службовыя часціны мовы. Выклічнік” (2 гадзіны)***

Узровень 1 (азнаямленне, разуменне) – максімальная адзнака 6 балаў

Прачытайце тэкст. На яго аснове запоўніце табліцу.

прыслоўе	безасабова-прэдыкатыўнае слова	прыназоўнік	злучнік	часціца

У глыбокай даліне, нібы прытаіўшыся, – хутар з вялікім садам і стогадовай хатай.

Гасцей запрашаюць спачатку чамусьці ў чорную кухню, адтуль у чысцейшую хату, дзе чуваць яшчэ кухонная кіслая затхласць, а тады ўжо – у зусім чыстую, прыстойную святліцу.

На гэтым хутары, свядома пакінутым, не перацягнутым у вёску, стаіць найбольшая калгасная пасека, жыве яшчэ адзін цікавы дзед.

З'явіўся ён перад намі ў самым несвяточным выглядзе. Прыехаў аднекуль верхам, цяжка ссунуўся жыватом з каня, чарнаногі, лахматы, расхрыстаны. Ажно падумалася: «І як яго, такога, пчолы падпускаюць?» А цану сабе ведае: «Школа – што? Трэба практыка». Старшыня расказваў нам у дарозе, што сюды, да дзеда, ён пасылае дзяўчат пасля пчалярскай школы. Падвучыцца. Мудрай народнай цярплівасці, любві да справы.

Дзед прыкметна збянтэжыўся свайго выгляду, выйшаў, пакінуўшы нас у святліцы, а неўзабаве вярнуўся ў чыстай кашулі, зашпілены на ўсе гузікі, у іншых портках, ногі схаваўшы ў боты. Тады вось і сказаў ён сваё, поўнае заслужанай годнасці: «Школа – што?»

У вялікім садзе мноства вулляў. Заўсёды яны... амаль хвалююць мяне сваёй шматфарбнасцю, як у маленстве хвалявалі рознакаляровыя алоўкі. Навошта вуллі фарбуюць па-рознаму – для пчол ці для нашага, чалавечага, вока? Шкада, не спытаўся ў старога, успомніў пра гэта толькі пасля.

Вуллі маўчаць, адно каля ляткоў руплівіды снуюць ды трохі лётаюць. Здаецца, вялыя ад вогкай хмарнасці. Колькі тут звону бывае пры сонцы! А колькі мёду – для ўсіх! Наіўнае, прыемнае, нібы новае адчуванне.

Упершыню пачуў тут, калі сядзелі за сталом, што апошняя чарка называецца расхадуха. Стары разварушыўся, многа расказваў пра свае паляванні — пры цару, пры панах і цяпер.

У гэтай стогадовай хаце, моцнай яшчэ на дзесяткі гадоў падумалася і такое. На нашай зямлі беларускай, не такой ужо і вялікай, старанна, у густую клетачку прачасанай трактарамі ды аўтамашынамі, абходжанай меліяратарамі ды геолагамі, нізенька аблятанай сельскагаспадарчымі самалётамі, можна, аказваецца, наткнуцца і на такі старасвецкі хутар, на такога спрадвечнага дзеда. Хоць Чорнаму яго, хоць Караткевічу – у самы густы «несучасны» раман.

У заключэнне нашай сустрэчы мы фатаграфаваліся. Бо і сонца, вельмі дарэчы, паказалася. Дзед стаў там, дзе яго папрасілі стаяць, – на фоне саду з вуллямі. Абапал – дочкі, тая рэшта сям'і, што захавалася каля дому: пажылая, рухавая гаспадыня і сімпатычная студэнтка медінстытута. А спераду – унучка, светленькая няўрымста. Ды тут, па прыкладу старэйшых, яна супакоілася, застыла, перастала нават усміхацца, для большай пэўнасці шмарганууўшы носам.

Толькі студэнтачка ўсміхнулася ў самы апошні момант. Хораша. Трошкі какетліва. Ну, але як жа без гэтага?

Узровень 2 (прымяненне, аналіз) – максімальная адзнака 8 балаў

Стварыце канцэптуальныя табліцы “Прыслоўе як часціна мовы. Безасабова-прэдыкатыўныя словы”, “Слубовыя часціны мовы”.

Узровень 3 (сінтэз, ацэнка) – максімальная адзнака 10 балаў

Стварыце канцэптуальныя табліцы “Прыслоўе як часціна мовы. Безасабова-прэдыкатыўныя словы”, “Слубовыя часціны мовы”.

Дапоўніце іх прыкладамі з твораў дзіцячай літаратуры.

Прыкладны пералік пытанняў да заліку

1. Нацыянальная мова. Дзяржаўная мова. Нормы літаратурнай мовы.
2. Паходжанне беларускай мовы і асноўныя этапы яе развіцця.
3. Фунцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму. Інтэрферэнцыя, яе віды.
4. Фанетыка як раздзел мовазнаўства. Асноўныя фанетычныя адзінкі: гук, склад, фанетычнае слова, маўленчы такт, фраза, тэкст; націск, інтанацыя. Фанетычная транскрыпцыя.
5. Гукі беларускай мовы. Акустычны, артыкуляцыйны і функцыянальны аспекты вывучэння гукаў мовы. Паняцце пра фаналогію.
6. Галосныя гукі. Класіфікацыя галосных гукаў.
7. Зычныя гукі. Класіфікацыя зычных гукаў.
8. Моцная і слабая пазіцыі гукаў. Узаемадзеянне гукаў у маўленчай плыні. Пазіцыйныя і камбінаторныя змены галосных і зычных гукаў.
9. Фанетычныя асаблівасці беларускай мовы ў сістэме галосных і зычных гукаў (у параўнанні з рускай мовай).
10. Арфаэпія, яе прадмет і задачы. Арфаэпічная норма і культура маўлення. Прычыны адхіленняў ад нормаў літаратурнага вымаўлення.
11. Графіка, яе прадмет і задачы. Пісьмо і яго віды. Беларускі алфавіт.
12. Літары, іх гукавое значэнне. Нялітарныя графічныя сродкі: апостраф, злучок (дэфіс), пунктуацыйныя знакі, знак націску, знак параграфа.
13. Арфаграфія, яе прадмет і задачы. Апорнае напісанне і арфаграма. Раздзелы арфаграфіі.
14. Прынцыпы беларускай арфаграфіі. Правілы, заснаваныя на фанетычным і марфалагічным прынцыпах напісання. Дыферэнцыйныя і традыцыйныя напісанні ў сучаснай беларускай мове.
15. Лексікалогія як раздзел мовазнаўства. Лексічны склад мовы.
16. Слова як асноўная цэласная адзінка мовы. Лексічнае і граматычнае значэнні слова. Слова і паняцце. Слова і словаформа.
17. Лексічнае значэнне слова. Тыпы лексічных значэнняў слова. Мнагазначнасць слова.
18. Амонімы. Лексічныя амонімы. Амаформы, амафоны, амографы. Шляхі ўзнікнення амонімаў.
19. Сінонімы. Сінанімічны рад, дамінанта. Разрады сінонімаў: семантычныя (ідэаграфічныя), стылістычныя, семантыка-стылістычныя.
20. Антонімы, іх тыпы. Стылістычнае выкарыстанне антонімаў. Антытэза. Аксюмаран.
21. Паронімы.
22. Фразеалогія як раздзел мовазнаўства. Разуменне фразеалогіі ў вузкім і шырокім сэнсе.
23. Класіфікацыя фразеалагізмаў.
24. Прыказкі, устойлівыя параўнанні, афарызмы. Перыфразы.
25. Марфема, яе адметныя рысы. Тыпы марфем.

26. Словаўтваральны тып і словаўтваральны спосаб. Асноўныя спосабы ўтварэння слоў у беларускай мове.

27. Марфалогія як частка граматыкі. Часціны мовы як лексіка-граматычныя класы слоў.

28. Назоўнік як часціна мовы: лексічнае значэнне, граматычныя катэгорыі і сінтаксічныя функцыі. Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў.

29. Граматычныя катэгорыі назоўнікаў: род, лік, склон.

30. Скланенне назоўнікаў у сучаснай беларускай мове.

31. Правапіс суфіксаў назоўнікаў. Правапіс складаных назоўнікаў.

32. Прыметнік як часціна мовы: лексічнае значэнне, граматычныя катэгорыі і сінтаксічныя функцыі.

33. Разрады прыметнікаў. Пераход прыметнікаў з аднаго разраду ў другі.

34. Ступені параўнання якасных прыметнікаў, іх значэнне і ўтварэнне.

35. Скланенне якасных, адносных і прыналежных прыметнікаў..

36. Правапіс складаных прыметнікаў.

37. Лічэбнік як часціна мовы: лексічнае значэнне, граматычныя катэгорыі і сінтаксічныя функцыі. Разрады лічэбнікаў. Скланенне лічэбнікаў розных разрадаў. Правапіс лічэбнікаў.

38. Займеннік як часціна мовы: лексічнае значэнне, граматычныя катэгорыі і сінтаксічныя функцыі. Разрады займеннікаў. Скланенне займеннікаў, іх правапіс. Ужыванне і правапіс займеннікаў у беларускай мове.

39. Дзеяслоў як часціна мовы: лексічнае значэнне, граматычныя катэгорыі і сінтаксічныя функцыі. Спрагальныя і неспрагальныя, зменныя і нязменныя формы дзеяслова.

40. Неазначальная форма дзеяслова (інфінітыў), яе граматычныя катэгорыі і сінтаксічныя функцыі.

41. Прэдыкатыўныя і непрэдыкатыўны катэгорыі дзеяслова. Спражэнне дзеясловаў.

42. Правапіс суфіксаў дзеясловаў.

43. Дзеепрыметнік як зменная форма дзеяслова.

44. Дзеепрыслоўе як нязменная форма дзеяслова.

45. Прыслоўе як часціна мовы. Безасабова-прэдыкатыўныя словы. Лексічнае значэнне, граматычныя катэгорыі і сінтаксічныя функцыі прыслоўяў.

46. Службовыя часціны мовы.

47. Выклічнік як часціна мовы. Гукапераймальныя словы.

48. Сінтаксіс, яго прадмет і задачы. Асноўныя сінтаксічныя адзінкі: словазлучэнне, сказ, тэкст. Сінтаксічная сувязь (злучэнне, падпарадкаванне).

49. Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Асноўныя прыметы словазлучэння.

50. Просты сказ як сінтаксічная адзінка. Асноўныя прыметы сказа. Тыпы сказаў.

51. Двухсастаўныя сказы. Галоўныя і даданыя члены сказа.

52. Аднасастаўныя сказы. Тыпы аднасастаўных сказаў.

53. Няпоўныя сказы. Разнавіднасці няпоўных сказаў. Адрозненне няпоўных сказаў ад аднасастаўных.

54. Агульная характарыстыка простага ўскладненага сказа. Віды ўскладненых сказаў.

55. Складаны сказ як сінтаксічная адзінка.

Пратакол узгаднення вучэбнай праграмы

Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне	Назва кафедры	Прапановы аб змяненнях у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па дысцыпліне	Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму
Руская мова	Кафедра мовазнаўства і лінгвадыдактыкі	Змест праграм узгоднены на стадыі распрацоўкі	Пратакол № 6 ад 25.01.2024